

**М. БАНДАРЭНКА**
бібліятэкар аддзела маркетынгу,
сацыякультурнай дзейнасці
і метадычнай работы
ДУК "Мазырская цэнтральная
раённая бібліятэка імя А. С. Пушкіна"

# Беларусь і Ян Баршчэўскі

## Літаратурная майстэрня паводле апавяданняў Яна Баршчэўскага са зборніка "Шляхціц Завальня..." для вучняў старэйшага школьнага ўзросту

***Мэты:*** пашырыць уяўленне вучняў пра асобу Яна Баршчэўскага і яго творчасць; фарміраваць у вучняў грамадзянскую адказнасць сродкамі беларускай літаратуры; абуджаць пачуццё гонару за Беларусь; умацаваць супрацоўніцтва праз працу ў невялікіх групах.

***Папярэдняя работа:*** падрыхтоўка паведамленняў пра жыццё і творчасць Я. Баршчэўскага.

***Эпіграфы:***

*Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.*
Я. Баршчэўскі

*Цуды можна разумець сэрцам, а не навукаю.*
Я. Баршчэўскі

### Ход мерапрыемства

**Вядучы.** Звярніце ўвагу на партрэт пісьменніка. Якія здагадкі і меркаванні ў вас узнікаюць пра яго як чалавека?

**Літаратурны дэтэктыў.** Выберыце пункты, звязаныя з біяграфіяй пісьменніка, прадстаўленага на фотаздымку. (Вакол фотаздымка пісьменніка з'яўляюцца карткі з правільнымі адказамі вучняў.)

*1. Ян Баршчэўскі.* 2. Фальварак Свіраны, Віленская губерня. 3. Друкаваўся пад псеўданімам Мацей Бурачок. *4. Вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме.* 5. нарадзіўся 21 сакавіка 1840 года. *6. Першыя вядомыя вершы, напісаныя па-беларуску,— "Дзеванька" і "Бунт хлопаў".* 7. Працаваў у судовай палаце. *8. У 1844–1846 гадах выдаў свой галоўны твор "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях".* 9. Увосень 1891 года ў Кракаве выходзіць першы зборнік паэта "Дудка беларуская". 10. Пісаў і друкаваў свае творы лацінкай. *11. Большая частка твораў напісана на польскай мове, аднак у іх пісьменнік звяртаўся да беларускіх паданняў, фальклорных сюжэтаў і вобразаў ("Дзве бярозы", "Курганы" і інш.).*

***Адказы:*** 1, 4, 6, 8, 11.

***Пасля гэтага навучэнцы слухаюць паведамленні і параўноўваюць свае меркаванні і веды з фактычным матэрыялам.***

Бандарэнка, М. Беларусь і Ян Баршчэўскі : [Літаратурная майстэрня паводле апавяданняў Яна Баршчэўскага са зборніка "Шляхціц Завальня..." для вучняў старэйшага школьнага ўзросту] / М. Бандарэнка // Бібліятэка прапануе. - 2026. - № 3 - С. 12-14.

**Вядучы.** Нялёгкі быў лёс пісьменніка. Ніхто не ведае яго дакладнай даты нараджэння. Бібліёграфы назвалі 1794 год. Той факт, што Ян Баршчэўскі навучаўся ў езуітаў, сведчыць пра невялікія дастаткі яго бацькоў. Пісьменнік многа падарожнічаў, магчыма, гэта былі марскія падарожжы, бо іх ён апісвае ў сваіх апавяданнях: "Я апавядаў маім землякам аб прыгодах, што здараліся ў маім жыцці, як пакінуў Беларусь. Але найбольш іх займалі небяспечныя марскія падарожжы, буры, малюнкі гор і берагоў чужых краін".

*Выступленні вучняў з паведамленнямі пра Я. Баршчэўскага.*

**Вучань.** Пасля падарожжаў, наведваючы родныя мясціны, Ян Баршчэўскі знайшоў тут сваё каханне і сваю Беларусь. Але гэта было трагічнае каханне, бо рэлігійныя перакананні, мараль таго часу сталі на яго шляху.

Уцеху ён знайшоў у працы: даў згоду стаць выдаўцом альманаха "Незабудка". Пісьменнік любіў і добра ведаў свой край, таму вырашыў заняцца канкрэтнаю справаю дзеля сваёй Беларусі. Але літаратар з вядомым ужо іменем марыў пабачыць другія куткі роднай зямлі. Графіня Юлія Равуская, якая адпраўлялася ў свае маёнткі, запрасіла яго з сабою ў Цуднаў.

**Вучаніца.** Адсюль Ян Башчэўскі таксама вандраваў пешшу па наваколлі, наведваў новых сяброў. Усюды, куды ён прыходзіў, яго сардэчна прымалі, і ён доўга гасцяваў: то вучыў панскіх дзяцей, то гутарыў з бацькамі, нават хацеў застацца тут назаўсёды. Так яно і здарылася: пражыўшы ў Цуднаве пяць гадоў, ён памірае 11 сакавіка 1851 года.

**Вучань.** Р. Падбярэскі, які быў яго бібліёграфам, сцвярджаў, што не было больш чалавека, "каторы са шмат якіх бакоў знаў так Беларусь". Калі ён атрымаў ад паэта (Ян Баршчэўскі ў пачатку сваёй творчасці пісаў у вершаванай форме) "Успаміны пра наведванне роднага краю", дык абазначыў, што гэта "вынятка з вялікага твора, у якім малюецца Беларусь пад тытулам «Шляхціц Завальня, або Аповесці беларускага люду, пададзеныя ў фантастычных фантазіях», бо ў гэтым творы мяжы між рэальным і нерэальным не існуе".

**Вучаніца.** У аповесці цікава і незвычайна апісваюцца вандраванні Плачкі. Гэты вобраз Плачкі-Беларусі пісьменнік робіць галоўным. Яна з'яўляецца ва ўсіх апошніх апавяданнях. Плачку бачаць толькі ў Беларусі — на месцах знакамітых бітваў, на могілках, дзе пахаваныя славутыя героі краю. Жанчына апякуецца таксама сваімі нешчаслівымі дзецьмі. Яна хоча сваёй Жывой вадою абудзіць нацыянальную свядомасць народа. Фантастычны вобраз Завальні, якому цікава паслухаць народныя паданні і легенды, якія выдумляюць яго пастаяльцы. Асабліва ён любіць слухаць казачныя аповеды пра чарцей, прывідаў, заклятых каралевічаў. Для гэтага ён, калі зімой падарожных менш, запальвае ў акне свечку, каб яны маглі патрапіць да




яго на начлег. Любіць Завальня, калі ў яго многа гасцей і яны па чарзе расказваюць яму прыгожыя вясковыя гісторыі, у якія верыў беларускі народ.

**Вядучы.** А цяпер, калі вам таксама спадабаўся гэты герой, працягнем нашу майстэрню менавіта са звестак пра яго. Раскажыце, чым вам спадабаўся пан Завальня, што ў яго характары вам паказалася незвычайным і нават смешным. *(Адказы.)*

Ідэяй служэння роднаму краю, роднай Беларусі пранізана творчасць Яна Баршчэўскага. Сваімі творамі ён адлюстроўвае гістарычны шлях беларускага народа.

**Праца майстэрні**

*I. Самаканструкцыя.*

*II. Паразважайце, што для пісьменніка азначаюць паняцці "Беларусь", "беларусы". Запішыце шэраг характарыстык на падставе твора:*

— Беларусь — старажытная, з багатымі традыцыямі, незалежная…

— Беларусы — высакародныя, паважаюць мінулае, традыцыі, дбаюць пра будучае…

*III. Вобраз шляхціца Завальні.*

**Вядучы.** Перад намі не звычайны твор, а "кніга сэрцаў і характараў людскіх", у якой Ян Баршчэўскі адным з першых звярнуў увагу на самабытнасць беларускай міфалогіі, традыцый і вераванняў народа. У вуснай народнай творчасці ён убачыў крыніцу пазнання багатага духоўнага свету беларусаў і важны сродак нацыянальнага адраджэння. І гэта ў той час, калі нават саму назву "Беларусь" было забаронена ўжываць у афіцыйных паперах. Расійскі цар Мікалай I увёў такую забарону ў 1840 годзе. У кнізе выразна выяўлены маральна-этычныя погляды народа. Сучаснік Яна Баршчэўскага, выдатны беларускі крытык, публіцыст Рамуальд Падбярэскі пісаў: "Тое, што піша пан Баршчэўскі прозай… мае



сувязь… з духам і паэзіяй народа, адкуль выйшлі гісторыя, і літаратура, і мова".

Кампазіцыйна твор складаецца з апавяданняў-прытчаў, устаўных навел, лірычных адступленняў і ўспамінаў. Звязваюцца яны пры дапамозе шырокавядомага са старажытнасці прыёму: увядзення вобраза слухача і каментатара народных апавяданняў — шляхціца Завальні.

*IV. "Каменты".*

Знайдзіце ў тэксце апавядання аўтарскую характарыстыку пана Завальні, назавіце яго рысы характару.

Апішыце край, у якім ён жыў.

Якім вы ўяўляеце пана Завальню?

Пасля аналізу вобраза шляхціца Завальні вучні знаёмяцца з каментарыямі на гэтую ж тэму на прапанаваным літаратурным партале, параўноўваюць са сваім поглядам, па магчымасці пішуць уласны каментарый.

*V. Сацыяканструкцыя. Работа ў 3 групах.*

*Група 1.* Даць ацэнку твору Я. Баршчэўскага паводле яго апоры на нацыянальныя традыцыі беларусаў.

*Група 2.* Даць ацэнку твору адносна яго скіраванасці на агульначалавечыя нормы маралі.

*Група 3.* Ацаніць актуальнасць твора ў нашы дні.

*VI. Кінаклуб.*

Прагляд эпізодаў фільма па матывах твораў Я. Баршчэўскага праз прыём "Стоп-кадр".

Дэманстрацыя аднаго кадра з заданнем: складанне працягу фільма з наступным праглядам і абмеркаваннем.

Пытанні для абмеркавання:

- Якая галоўная тэма фрагмента? Дайце назву фрагменту.
- Дзе адбываецца дзеянне? Апішыце сцэну, апішыце персанажаў, прадстаўленых у фрагменце. Назавіце іх і дайце ім ацэнку: якія з іх з'яўляюцца станоўчымі, а якія — адмоўнымі?
- Якія кінематаграфічныя прыёмы былі выкарыстаныя (праца аператара, мантаж, музычнае суправаджэнне)?
- Як суадносіцца фрагмент з мастацкай рэчаіснасцю?

Пытанні можа задаваць вядучы або вучні могуць самастойна працаваць з рабочымі лістамі; магчымая і праца ў групах, а найлепшым будзе калектыўнае абмеркаванне.

Пасля гутаркі і прагляду эпізодаў фільма па матывах твораў Я. Баршчэўскага вучні запаўняюць табліцу "Ян Баршчэўскі" і адказваюць на пытанне: у чым значэнне дзейнасці Яна Баршчэўскага?

| | |
|---|---|
| 1. Назавіце асноўныя рысы асобы пісьменніка | |
| 2. Назавіце рысы творчасці пісьменніка, аб якіх вы даведаліся | |

*VII. Афішыраванне.*

Які галоўны пасыл (месыдж) быў бы ў вас, калі б вы здымалі фільм ці спектакль па творы?

Паспрабуйце стварыць:

Афішу да вашай уяўнай экранізацыі твора Яна Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях".

Рэкламны тэкст.

Рэцэнзію на фільм.

Падчас гэтага занятку вучні будуць працаваць у малых групах. Кожная група прадставіць свой праект класу.

*Пытанні для абмеркавання.*

1. Ці карысна фарміраваць пункт погляду на літаратурны твор на аснове экранізацыі?
2. Ці замяніць прагляд фільма ці спектакля чытанне літаратурнага твора? Чаму?
3. Калі б трэба было стварыць фільм пра беларусаў і Беларусь, які мастацкі твор вы прапанавалі б у якасці асновы? Чаму?

**Вядучы.** Гэты арыгінальны і цудоўны твор — адзіны па сваёй форме ў нашай літаратуры. На працягу многіх гадоў ён служыў для пісьменнікаў прыкладам высокага эталона, а ў вучняў выхоўваў нацыянальную годнасць і грамадзянскую адказнасць перад сваёй краінай.

### Спіс крыніц

1. Кавальчук, Т.Л. Данесці цудоўны скарб / Т.Л. Кавальчук.— Мінск: Экоперспектива.— 2013.— С. 23.

2. Творчасць Яна Баршчэўскага / Падбярэскі Р. Беларусь і Ян Баршчэўскі // [Электронны рэсурс].— 2025.— Рэжым доступу: https://web.archive.org/web/20090928222059/khblit.narod.ru/seminar/barszczewski40.htm — Дата доступу: 27.07.2025.

3. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В.У. Бухавец і інш.; пад агул. рэд. С.І. Цыбульскай.— Мн.: Сэр-Віт.— 2006.— С. 40.— (Майстэрня настаўніка).